Зубчонак, Н. А.

Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,

/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

## 2.2. ТЭОРЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА БУДАЎНІЦТВА БЕЛАРУСІ

Для кожнай краіны праблема дзяржаўнага будаўніцтва заўсёды тзастаецца надзённай. Выкананне гэтай задачы патрабуе шмат сіл – як фізічных, так і інтэлектуальных. Важна мець моцны тэарэтычны падмурак, які здолее злучыць ў адно цэлае ўсе неабходныя фактары. Адсутнасць падобнага вопыту ўскладніла палітычную сітуацыю ў Паўночна-Заходнім краі. З часоў былой дзяржаўнай магутнасці Вялікага княства Літоўскага прайшло не адно стагодзе, палітыка ўціску адмоўна адбілася на сацыяльным жыцці народа, на яго светаадчуванні, прытупіла свядомасць, пачуццё нацыянальнай годнасці.

Першыя нацыянальныя легальныя выданні паставілі перад сабой задачу распрацоўкі тэорыі дзяржаўнага будаўніцтва. Публіцыстыка імкнулася ажывіць беларускую ідэю, сабраць у адно накоплены за апошні час вопыт па духоўнаму адраджэнню народа, нарэшце, вызначыць асноўныя прынцыпы і палажэнні, намеціць шляхі, якімі пойдзе ў новы час дзяржава.

Першы крок быў зроблены «Нашай доляй»: «Мы аб’яўляем вайну ўсім цёмным сілам, каторым дзеля карысці сваёй вялікая выгада была трымаць васьмімільённы народ беларускі ў нядолі і паняверцы, баламуціць і дурыць яго» [«Наша доля», 1906, № 1]. Гэта быў своеасаблівы заклік да тых грамадскіх прагрэсіўных сіл, што нараджаліся ў віхуры рэвалюцыйных падзей, фарміраваліся ў міжрэвалюцыйны час. Самае галоўнае – узрушыць народ, прымусіць задумацца над тым, як ён жыве сёння, пастарацца дапамагчы зазірнуць у заўтрашні дзень. Вельмі важна, каб прызыў да абуджэння быў як мага мацнейшым.

Задумы і планы «Нашай долі» пазней распрацоўваліся іншымі беларускімі газетамі, у прыватнасці, «Нашай нівай». Яна не толькі падтрымала праграму сваёй папярэдніцы (хаця рэдакцыя напачатку катэгарычна заяўляла, што іх выданне абсалютна самастойнае), але і прадоўжыла, а пазней і завяршыла распачатую справу.

Падрабязны аналіз нашаніўскай публіцыстыкі ў наш час вельмі неабходны па некалькіх прычынах. Па-першае таму, што на яе старонках ў пачатку XX ст. былі распрацаваны асноўныя кірункі далейшага будаўніцтва беларускай нацыянальнай дзяржавы. Трэба адзначыць, што пазіцыі рэдакцыі ў гэтым пытанні былі правільныя і

даволі моцныя. Гісторыя ўжо неаднойчы гэта пацвярджала: менавіта ва ўсе перыяды беларусізацыі першым аб'ектам увагі станавілася «Наша ніва», яе праграма і публіцыстыка. Другі, не менш важны, доказ, — гэта тое, што ні адно беларускамоўнае тагачаснае выданне не падвяргалася такім нападам як з боку манархічнай, рэакцыйнай прэсы, так і з боку сацыял-дэмакратычных газет.

Значэнне і роля «Нашай нівы» былі настолькі вялікімі, што ўсе астатнія беларускія газеты і часопісы адыходзілі на другі план, уступаючы першынство «нашаніўцам». У міжрэвалюцыйны перыяд на Беларусі выходзіла 12 нацыянальных газет і часопісаў. Такую сітуацыю растлумачыць можна, прынамсі, трыма прычынамі. Па-першае, усе беларускамоўныя выданні таго часу так ці іначай былі звязаны з «Нашай нівай» (ідэйна, матэрыяльна), развіваліся пад яе ўплывам, залежалі ад яе, ад пазіцый адзінай на Беларусі нацыянальна-дэмакратычнай партыі – БСГ. Па-другое, грамадству было прапанавана сапраўды беларускае нацыянальнае выданне, пазіцыі якога непакоілі правячыя колы Расійскай імперыі, якая ўжо траціла сваю магутнасць. Самыя таленавітыя, прагрэсіўныя і адукаваныя людзі таго часу прыйшлі працаваць менавіта ў «Нашу ніву». І нарэшце, ні час, ні змена палітычных рэжымаў у краіне не здолелі перакрэсліць гэты перыяд. Ён так і застаўся «нашаніўскім» і ў 30-я гады, і ў 90-я, у развіцці новай літаратуры, у станаўленні публіцыстыкі, у фарміраванні нацыянальнай эстэтыкі, у беларускай гісторыі. Неабходна падкрэсліць, што агульны фон публіцыстыкі стваралі менавіта ўсе выданні ў сукупнасці. Можна сярод іх выдзеліць больш прагрэсіўныя ці менш прагрэсіўныя, тыя, якія смела ішлі наперад у сваіх меркаваннях («Наша доля», «Наша ніва», «Маладая Беларусь», «Беларускі каляндар "Нашай нівы"), і тыя, якія нібы асцерагаліся зрабіць няправільны крок, памыліцца («Belarus», «Homan», «Svetač»).

У кожнага з гэтых выданняў быў свой шлях да народа – праз адраджэнне нацыянальных традыцый, культуры, праз беларускую сістэму адукацыі. Аднак гэты кірунак можна было б лічыць няпоўным, каб не напамін людзям аб шчырасці, зычлівасці, вялікадушнасці, літасці, любові да бліжняга. Ніякія нават самыя моцныя сацыяльныя і палітычныя зрухі не павінны знішчыць у чалавеку яго лепшыя якасці, усё тое, што збліжае людзей, робіць іх мудрэйшымі [«Bielarus», 1915, № 6].

З першых часоў заснавання беларускіх газет іх рэдакцыі цвёрда разумелі і ведалі, што любая дзяржава трымаецца на моцнай нацыянальнай палітыцы. Ад ступені вырашанасці нацыянальнага пытання залежыць будучыня краіны. Газеты прапаноўвалі свой погляд на вырашэнне гэтай праблемы: «Прыглядаючыся бліжэй да агульнага беларускага жыцця, прыкмецім мы ў ім чатыры найважнейшыя бакі ці кірункі, якія кожны беларус, свядомы ці несвядомы, імкнецца здаволіць, гэта кірунак духоўных патрэб, грамадзянскіх, палітычных і

эканамічных» [«Наша ніва», 1912, № 2]. Такім чынам, вырашэнне нацыянальнага пытання ў беларускім друку вялося ў наступных напрамках: моўным, культурна-асветніцкім, дзяржаўна-прававым, эканамічным, палітычным, тэрытарыяльным.

Толькі тады, калі наш народ будзе цвёрда ўсведамляць важнасць кожнага з названых вышэй палажэнняў, ён зможа стварыць моцную дзяржаву і вырашаць ужо ўнутраныя праблемы (незалежнасць улады, рэлігійны нейтралітэт, наяўнасць арміі, адзінай прававой і судовай сістэмаў і г. д.). У любой дзяржаве нацыянальная палітыка павінна быць накіраванай на рэалізацыю нацыянальных інтарэсаў і ліквідацыю супярэчнасцей. «Развіваць культуру і выяўляць свае творчыя сілы кожная нацыя можа толькі тады, калі ёй дадзена на гэта галоўная воля. Поўная свабода культурна-нацыянальнага развіцця – гэта першы варунак для развіцця такога краю» [«Наша ніва», 1912, № 28--29].

У шматнацыянальнай дзяржаве адносіны паміж народамі павінны будавацца на прынцыпах раўнапраўя, супрацоўніцтва, узаемнай павагі інтарэсаў і каштоўнасцей, непрымірымасці да шавінізму і г. д. Больш таго, нацыянальная палітыка прадугледжвае аказанне дапамогі малым народам у развіцці іх эканомікі і культуры. Ужо той факт, што ўрад Расійскай імперыі катэгарычна адмаўляў малым народам, у прыватнасці беларусам, у праве на самавызначэнне, гаворыць аб нетрываласці яе дзяржаўнай улады, аб немагчымасці яе існавання ў старым выглядзе ў новых сацыяльна-палітычных умовах пачатку XX ст. Беларускія публіцысты таго часу пачалі актыўна пісаць аб неабходнасці нацыянальнага самавызначэння народа.

Нацыя ніколі не можа стаць прадуктам чалавечай творчасці, яна – прадукт творчасці прыроды, як і мова, як і псіхафізічны тып чалавека. Ужо па гэтай прычыне павінна быць зразумела, што нармальная палітычная сістэма кіравання можа ўсталявацца толькі там, дзе пражывае аднародная маса людзей па свайму бытавому, культурнаму і грамадзянскаму ўкладу.